Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЕЛЯНСКІХ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АУТОРАК
29 верасьня 1931 г.
№ 226 (3315)

Супроць ядоцкага прынцыпу разьмеркаваньня калгасных даходаў

У бліжэйшыя дні ўся калгасная Беларусь прыступае да масавага разьмеркаваньня калгасных даходаў.

Разьмеркаваньне даходаў у калгасах падагульвае вынікі гаспадарчага году і замацоўвае дасягнутыя посьпехі. Пры разьмеркаваньні даходаў калгасьнікі і абкружаючыя іх аднаасобнікі на вочна пераконваюцца ў перавагах буйнай аграмаджанай гаспадаркі, ясна бачаць, наколькі ўзьнімаецца прадукцыйнасьць працы, наколькі паляпшаецца матар'яльны дабрабыт калгасьнікаў у параўнаньні з іх мінулым, як ад наасобнікаў, якія пэрспэктывы для бедноты і серадняковаў адкрывае калгасная вытворчасьць.

Тым самым разьмеркаваньне даходаў дапамагае ня толькі замацаваньню калгасаў, але і новаму прыліву ў калгасы, арганізацыі новых калгасаў. Ствараючы і ўзмацняючы недзялімыя фонды, правільнае разьмеркаваньне даходаў пашырае вытворчую базу калгасаў і стымулюе больш хуткія тэмпы працэсаў абагульненьня ў калгасах. Выяўляючы таварныя лішкі і садзейнічаючы іх хутчэйшай здачы (продажу) дзяржаве, правільнае разьмеркаваньне даходаў узмацняе сувязь калгаснага сялянства з рабочай клясай, з усёй сацыялістычнай эканомікай нашай краіны.

Усё гэта і робіць кампанію разьмеркаваньня даходаў важнейшай кампаніяй, якая мае вялізарнае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Недарма кулак усімі сіламі імкнецца падарваць правільнае разьмеркаваньне калгасных даходаў і навязаць калгасьнікам такі парадак, які-б садзейнічаў развалу калгаснай вытворчасьці, зьніжэньню прадукцыйнасьці працы. Недарма асноўную сілу свайго агня кулак накіроўвае іменна ў гэты бок, іменна на гэту частку, важнейшую частку арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

Змагаючыся з кулакімі ўплывамі, разам з тым неабходна перамагчы тыя наплываецельскія, «самацечныя», правапартуністычныя адносіны да справы разьмеркаваньня калгасных даходаў, недазнанку важнасьці гэтай работы, якія яшчэ маюць месца ў радзе раёнаў. Разьмеркаваньне даходаў, якое мае вялізарнае значэньне для далейшага ўзьлёту хвалі калектывізацыі, для справы арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў, павінна быць забясьпечана сталым сыстэматычным, эпэрацыйным кіраўніцтвам з боку партыйных арганізацый, саветаў і калгаснай сыстэмы.

Такая-ж рашучая барацьба павінна весьціся і з «лявацкімі» адносінамі да гэтай важнейшай палітычнай і гаспадарчай справы. «Лявацкія» загібы ў разьмеркаваньні калгасных даходаў за ключаюцца, у тым, што кіраўнікі калгасаў за сьпіной калгасьнікаў вырашаюць усё, і пасьля гэтага свае рашэньне падаюць калгасьнікам у вілзе загаду.

Захаваньне асноўнага прынцыпу разьмеркаваньня калгасных даходаў—«хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае», разьмеркаваньне даходаў па працадніёх на аснове зьдзельшчыны павінна быць забясьпечана поўнасьцю і цалкам. Ураўніліўцы і падоцкай сыстэме разьмеркаваньня па вінен быць нанесены рашучы бязьлітасны ўдар.

Сутнасьць ядоцкай сыстэмы заключаецца ў імкненьні дабіцца роўнага здавальненьня запатрабаваньняў сем'яў калгасьнікаў прапарцыянальна ліку едакоў. Гэта сыстэма—вялізарны тормаз калектывізацыі. Яна памяншае зацікаўленасьць калгасьнікаў у калгаснай вытворчасьці, бо атрыманьне даходаў у гэтым выпадку не зьвязваецца з удзелам калгасьнікаў у вытворчасьці, іх працоўнай актыўнасьцю. Харак тэрна, што адным з матываў нявыхаду на работу, адмаўленьня ад работы ў радзе калгасаў было нежаданьне працаваць на «чужых» едакоў.

Шкоднасьць паядоцкай сыстэмы разьмеркаваньня даходаў яшчэ і ў тым, што пры ёй разьвіваюцца спажывецкія настроі, імкненьні надмерна пад высіць спажывецкія нормы, устанавіць харчовыя пайкі, расьцягнуць калгасны ўраджай па дварох. Мы мелі ў мінулым годзе такія факты, калі многія калгасы, у імкненьні пабольш разьмеркаваць па едакох у натуральнай форме, захоўвалі свае таварныя магчымасьці, выдавалі па дзясятках пудоў збожжа і іншых прадуктаў нават... грудным дзецям.

Паядоцкая сыстэма разьмеркаваньня даходаў затрымлівае рост калгаснай вытворчасьці, рост накапленьня ў калгасах, дыскрэдытуе калгас, як форму сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

У мінулым годзе 30,7 проц. усіх калгасаў Савецкай Беларусі разьмеркавалі даходы па едакох. Гэты факт павінен прымусіць нас мацнейшым чынам на старожыцца цяпер, мабілізаваць клясавую пільнасьць, мабілізаваць ярасьць калгасьнікаў для барацьбы, для канчатковай перамогі над гэтай найшкаднейшай сыстэмай, разьмеркаваньня калгасных даходаў. Трэба каб кожны калгасьнік усьвядоміў, што паядоцкая сыстэма разьмеркаваньня калгасных даходаў, гэта—зброя барацьбы кулака і правага апартунізму з калгасамі ,адзін з асноўных мэтадаў развалу калгасаў.

Мы досыць часта сустракалі ў мінулым годзе факты камбінаванага ўжываньня паядоцкай сыстэмы разьмеркаваньня калгасных даходаў. Былі факты, калі натуральную частку даходаў разьмяркоўвалі па едакох,, а грашовую—па працы. Былі факты, калі ў радзе калгасаў перш за ўсё выдавалі пайкі, а ўжо пасьля прыступалі да «удакладненьня» разьмеркаваньня даходаў.

Праўда, у бягучым годзе глыбока ў шырачэзныя масы калгасьнікаў пранікнула сьвядомасьць неабходнасьці разьмяркоўваць калгасныя даходы па працы, аднак, небясьпека скажэньняў гэтага прынцыпу не ліквідавана. Аб гэтым сьведчаць тыя шматлікія факты няправільнай выдачы авансаў, аб якіх паведамлялася на старонках нашай газэты (калгас «Полымя», «Чырвоны сьцяг» і г. д.).

Вось чаму неабходна зараз разгарнуць шырачэзную масавую работу, узбройць кожнага калгасьніка ведамі ня толькі агульных прынцыпаў разьмеркаваньня даходаў, але і тэхніці гэтага разьмеркаваньня. Трэба дамагчыся таго, каб гэта важнейшая гаспадарчая і палітычная кампанія была-б сапраўды масавай кампаніяй, каб кожны калгасьнік актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі разьмеркаваньня даходаў. Трэба давесьці да кожнага калгасьніка вядомыя пастановы калгасцэнтраў і наркамзему СССР і БССР.

У бліжэйшыя дні рэвізійныя камісіі ў калгасах павінны на справаздачных сходах расказаць калгасьнікам і масам бядняцка-серадняцкага сялянства аб выніках праверкі становішча ву чоту працы і агульнай справаздачнасьці ў калгасах, аб тых магчымасьцях, якія калгас мае для падвышэньня матар'яльнага ўзроўню сваіх членаў. Трэба, каб у бліжэйшыя дні кожны калгасьнік праверыў сваю працоўную кніжку. Трэба дамагчыся, каб кожны калгас быў гатовы спаткаць кампанію разьмеркаваньня даходаў на ўсесаюзнай лічбаў і фактаў росту калгаснай гаспадаркі.

Кастрычнік—рашучы месяц разьмеркаваньня калгасных даходаў. Да 1-га лістапада павінны быць разьмеркаваны сярод калгасьнікаў ня менш $^2/_3$ усіх належачых ім даходаў. На працягу гэтага месяца павінна быць арганізавана шырокая справаздачная кампанія праўленьняў калгасаў перад калгаснымі масамі і масамі бядняцка-серадняцкага індывідуальнага сялянства. На гэтай аснове яшчэ вышэй узьнімецца хваля калгаснага прыліву, яшчэ больш узмоцніцца калгасны рух, на вышэйшую ступень узьнімецца калгасная вытворчасьць. На гэтай аснове мы нанясем яшчэ адзін руйнуючы ўдар кулацтву і яго агентуры—правым і «левым» апартуністам.

Аб мерапрыемствах па палепшаньні становішча грамадзкага харчаваньня

Па станова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць, што рад пастаноў ЦК аб грамадзкім харчаваньні выконваецца дрэнна, пералому ў палепшаньні грамадзкага харчаваньня няма, асабліва ў якасьці. Становішча яго не здавальняе ўзросту запатрабаваньняў рабочых мас. Такое становішча тлумачыцца як дрэннай работай органаў каапэрацыі і Наркамснабу на гэтым вучастку, таксама і слабай увагай з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

Антысанітарнае становішча сталовых, перагрузка, безгаспадарчасьць, бездазнасьць адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу, абязьлічка ў арганізацыі работы, стратнасьць сталовых і дрэннае нядбайнае абслугоўваньне спажыўцоў.

У мэтах карэннага палепшаньня грамадзкага харчаваньня, выходзячы з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 19-VIII, ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

I. Па палепшаньні работы існуючых прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня

1. Абавязаць Наркамснаб поўнасьцю забясьпечыць фондамі зацьверджаныя пляны па грамадзкім харчаваньні ў адпаведным асартымэнце з тым, каб арганізацыі грамадзкага харчаваньня маглі цалкам скарыстаць іх для сваіх запатрабаваньняў. Вылучаныя фонды перадаваць па дагаворах, непасрэдна Белкаапхарчу, Белкаапсаюзу і Наркамснабу, апроч устаноўленых цэнтралізаваных фондаў — вызначыць мясцовыя фонды для павялічэньня забясьпечаньня грамадзкага харчаваньня. Даручыць Белкаапсаюзу і Наркамснабу на працягу пяцідзённага тэрміну ўстанавіць парадак і раёны загатовак для запатрабаваньняў грамадзкага харчаваньня, прадставіўшы правы заключэньня дагавораў паасобным сталоўкам у мэтах найбольшага разгортваньня мясцовай ініцыятывы.

2. Абавязаць Белкаапхарч у двухдэкадны тэрмін распрацаваць плян арганізацыі пры ўсіх сталовых сьвіна-кормачных, птушкаводных і трусавод ных пунктаў, скарыстоўваючы прадукцыю адкорму выключна да патрэб сталовых.

У зьмену ранейшай пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, устанавіць, што ўся прадукцыя адкорму па грамадзкім харчаваньні павінна цалкам ісьці для патрэб грамадзкага харчаваньня.

3. Катэгарычна забараніць якое-б там ні было зьмяншэньне норм харчаваньня за кошт павялічэньня колькасьці сталуючыхся, устанавіўшы, што ўся кае павялічэньне колькасьці сталуючыхся, выходзячы за межы цэнтралізаваных фондаў, утвараецца за кошт вышканьня дадатковых мясцовых рэсурсаў.

4. Даручыць Белкаапсаюзу па сэкцыі грамадзкага харчаваньня на працягу дэкады перагледзець існуючае палажэньне аб правох і абавязках загадчыкаў сталовых, пашырыўшы іх правы ў справе праўленьня мясцовай ініцыятывы па забясьпечаньні сталовых, усклаўшы пэрсанальную адказнасьць за санітарнае становішча сталовых, санітарную апрацоўку прадуктаў, старанную мойку іх, бярэжлівыя адносіны да пасуды і хаваньня прадуктаў — на загадчыкаў сталовых, ажыцьцяўляючы кантроль за правядзеньнем гэтага ў жыцьцё.

5. Прапанаваць Белкаапхарчу да 15-га верасьня арганізаваць ва ўсіх сталовых бракераж, незалежны адміністрацыйна ад загадчыкаў сталовых і падпарадкаваны непасрэдна сэкцыям каапхарчу, для ўдзелу ў якім прыцягваць саміх сталуючыхся і ўсю заводзкую грамадзкасьць.

6. Усклясьці на Белкаапхарч, яго сэкцыі і органы Наркамснабу адказнасьць за дастаўку добраякасных прадуктаў у патрэбным асартымэнце для забясьпечэньня сталовых. Абавязаць загадчыкаў сталовых адмаўляцца ад прыёму недабраякасных прадуктаў для грамадзкага харчаваньня.

7. Наркамахові Здароўя і Белкаапхарчу арганізаваць на мясцох сыстэматычны кантроль за правядзеньнем у жыцьцё санітарных правіл для сталовых. Наркамюсту БССР даць паказаньні сваім органам аб суровым пакаранні вінаватых у антысанітарным становішчы сталовых, гарбатных, буфэтаў і іншых прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня.

8. Прапанаваць Белкаапсаюзу — па сэкцыі грамадзкага харчаваньня і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня — на працягу верасьня месяца поўнасьцю скончыць перавод усіх сталовых на поўную зьдзельшчыну; у пяцідзённы тэрмін заключыць дагавор з ЦП саюзу аб увядзеньні прогрэсыўнай зьдзельшчыны ня менш, як у 15 буйных сталовых.

9. ЦК і СНК лічаць існуючае становішча стратнасьці ў закрытых сталовых—недапушчальным і прапануе Белкаапсаюзу да 15 кастрычніка дасягнуць поўнай рэнтабельнасьці іх, шляхам: устанаўленьня дасканалай калькуляцыі і адпаведных адпускных цэн; увядзеньне паблюднай сыстэмы ў водпуску іх па розных цэнах, а таксама шляхам разгортваньня буфэтнага продажу. Адным з галоўных момантаў у ліквідацыі стратнасьці сталовых павінна зьявіцца правядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і зьнижэньне выдаткаў.

10. Ставячы асноўнай і важнейшай задачай усіх каапэрацыйных, партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый—усямернае палепшаньне існуючых прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, ЦК і СНК прапануе Белкаапсаюзу распрацаваць і ўнесьці на зацьверджаньне ЭКАСА плян далейшага разгортваньня грамадзкага харчаваньня на IV квартал і 1932 г. з тым, каб забясьпечыць найбольш поўны ахоп рабочых і іх сем'яў і ў першую чаргу прадуглядзець у пляне далейшае разгортваньне самадзейных сталовых сталовых каапэрацыйната тыпу, буфэтаў, а таксама арганізацыю выторчасьці розных відаў безалкагольных напіткаў і продаж іх у буфэтах і ларках.

11. Даручыць Гаркому КП(б)Б і Гарсаветам прымацаваць з партыйнага актыву тэрмінам на два месяцы адказных працаўнікоў па два чалавекі да кожнай сталоўкі і іншых прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня для канкрэтнай дапамогі ў справе палепшаньня становішча гэтых прадпрыемстваў на падставе рашэньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. Адначасова прапанаваць Гаркомам і райкомам КП(б)Б заслухоўваць даклады аб становішчы паасобных сталовых.

12. Даручыць органам РСІ распрацаваць парадак кантролю за ажыцьцяўленьнем гэтай пастановы з найбольшым прыцягненьнем да гэтага кантролю рабочай грамадзкасьці.

II. Па матар'яльна-тэхнічнай базе грамадзкага харчаваньня

13. Адзначаючы зусім недапушчальныя адносіны гаспадарчых арганізацый да справы грамадзкага харчаваньня, якія прывялі да спыненьня будаўніцтва пераважнай колькасьці пачатых сталовых і павольных тэмпаў будаўніцтва на іншых, ЦК прапануе, пад асабістую адказнасьць тав. Амбражуноса — разгарнуць працу па сканчэньні сталовых пры прадпрыемствах: ф-ка «Кастрычнік», «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», раённая сталоўка на Ляхоўцы (Менск), «Дзьвіна», «Чырвоны Мэталіст», «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск), «Чырвоная Бярэзіна» (Барысаў).

СНК у трохдзённы тэрмін вылучыць для будаўніцтва гэтых сталовых неабходную колькасьць матар'ялаў, як для нечарговага ўдарнага будаўніцтва.

14. Прапанаваць Белкаапхарчу і яго сэкцыям на мясцох да лістапада месяца правесьці ўвесь бягучы рамонт па ўсіх сталовых (афарбоўка, пабелка і г. д.) для прывядзеньня іх у належны парадак і санітарнае становішча.

Улічваючы, што рад сталовых па БССР мае вострую патрэбу ў капітальным рамонце і пабудове падсобных памяшканьняў, прапанаваць Белкаапхарчу і яго сэкцыям неадкладна прыступіць да вытварэньня рамонту, з разьлікам сканчэньня яго не пазьней і сьнежня г. г. Даручыць Дзяржпляну вылучыць для рамонту сталовых неабходную колькасьць будаўнічых матар'ялаў.

15. Прапанаваць ВСНГ, Наркамснабу БССР даць заводакіраўніцтвам канкрэтнае паказаньне аб выкананьні пункту 7 пастановы ЦК УсеКП(б) аб абавязках заведакіраўніцтва ў прадстаўленьні годных і добраабсталяваных памяшканьняў для сталовых і буфэтаў і ў выпадку неабходнасьці—іх рамонту.

16. Абавязаць Белдзяржбуд — пад адказнасьць тав. Васэрмана—да 1-га студзеня скончыць будаўніцтва фабрыкі - кухні. Даручыць Дзяржпляну ў 3-хдзённы тэрмін вылучыць усе неабходныя будаўнічыя матар'ялы згодна прадстаўленай заяўкі.

17. Улічваючы вялікі недахоп у абсталяваньні па грамадзкім харчаваньні, абавязаць ВСНГ БССР у дэкадны тэрмін унесьці свае прапановы ў ЭКАСА аб пакрыцьці недахвату гэтага абсталяваньня шляхам пашырэньня і арганізацыі вырабу яго, як на заводах Белмэталяаб'яднаньня, так і па саматужнай каапэрацыі, а таксама падрыхтаваць поўнае пакрыцьцё патрэбы ў абсталяваньні па грамадзкім харчаваньні на 1932 г.

18. Даручыць ВСНГ на працягу 2 х дэкаднага тэрміну распрацаваць плян рэканструкцыі заводу «Чырвоны Мэталіст» (Барысаў), спэцыялізаваўшы яго выключна па вытворчасьці абсталяваньня для грамадзкага харчаваньня. Даручыць Дзяржпляну вылучыць для патрэб грамадзкага харчаваньня з фондаў іншых арганізацый 0,5 тон волава для лужэньня пасуды.

19. Прапанаваць Белкаапхарчу распрацаваць плян падвышэньня тэхнічнай базы грамадзкага харчаваньня, разгарнуўшы работу па мэханізацыі сталовых, арганізацыі свайго ўласнага транспарту і інш. Пры разьмеркаваньні аўтамашын улічыць патрэбу Белкаапхарчу.

20. Абавязаць Белкаапхарч шырака разгарнуць работу па мабілізацыі сродкаў (абанэмэнтаў) паставіўшы сваёй задачай хутчэйшы пераход да адмаўленьня ад банкаўскага крэдытаваньня. Адначасова паставіць перад Усекахарчам пытаньне аб задаволеньні сродкамі, як для выкананьня бягучых патрэб, так і для забясьпячэньня далейшага разгортваньня харчаваньня.

III. Кадры для грамадзкага харчаваньня

21. Даручыць Белкаапсаюзу і сэктару кадраў ЦК на працягу двух дэкад разглядзець плян падрыхтоўкі кадраў па сэкцыі грамадзкага харчаваньня, у бок яго пашырэньня, у мэтах найбольшага забясьпячэньня яго кадрамі.

22. Прапанаваць Белкаапхарчу забясьпечыць сваячасовы пачатак навучальнага году ў школах ФЗВ кулінараў у Віцебску, Магілеве, Гомлі і Менску і тэхнікуме грамадзкага харчаваньня. Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б, камсамолу і прафсаюзам аказаць дапамогу сэкцыям грамадзкага харчаваньня ў пасылцы кандыдатаў у Гомельскі тэхнікум грамадзкага харчаваньня, згодна дасланай разьвёрстцы.

23. Даручыць Белкаапхарчу распрацаваць пытаньне арганізацыі пры інстытуце спажыўкаапэрацыі спэцыяльнага аддзяленьня па грамадзкім харчаваньні.

24. Абавязаць сэктар кадраў ЦК вылучыць 5 адказных працаўнікоў для ўзмацненьня сэкцыі грамадзкага харчаваньня (тэрмін 5 дзён).

Прапанаваць каапэрацыйным, прафсаюзным і партыйным арганізацыям разгарнуць шырокую масавую работу на прадпрыемствах навакольдачных карэннай перабудовы справы грамадзкага харчаваньня на падставе пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, дабіўшыся разгортваньня масавага рабочага кантролю і канкрэтнай дапамогі ў перабудове.

Белкаапхарчу, разам з саюзам грамадзкага харчаваньня разгарнуць масавую работу па палітычным выхаваньні рабочых грамадзкага харчаваньня, укараненьні культурных навыкаў абслугоўваньня і мэтадаў сацыялістычнага ўдарніцтва.

Даручыць органам друку разгарнуць на старонках друку і асабліва ў газэце «Рабочай» кампанію аб ходзе выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, СНК па грамадзкім харчаваньні.

Сакратар ЦК КП(б)Б В. Шаранговіч.
Старшыня СНК БССР М. Галадзед.

КАРНЫЯ ЭКСПЭДЫЦЫІ „УЦІХАМІРВАЮЦЬ" ЗАХОДНЮЮ УКРАІНУ

Польскія пасьледвацелі Мураўёва-вешацеля пад ганебнай назвай „пацыфікацыі" робяць крывавую расправу над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі

КАМПАРТЫЯ ПОЛЬШЧЫ ЗАКЛІКАЕ ПРАЦОЎНЫХ ДАБАРАЦЬБЫ З ФАШЫСЦКІМ ТЭРОРАМ

БЭРЛІН, 23-IX. Заходняя Украіна зноў зьяўляецца арэнай дзеяньня карных экспэдыцый, якія зьвяшчаюць гарады, мястэчкі і вёскі.

Польскі фашызм ,каб прыдушыць рэвалюцыйны рух рабочых і сялян і гэтым расчысьціць шлях для ўзброенага нападу на СССР,—паўтарае так-зваецае «уціхаміраньне» Заходняй Украіны—вядомую ўсяму сьвету крывавую расправу з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі.

У сувязі з гэтым, Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі Польшчы зьвярнуўся да пралетараў і працоўных Заходняй Украіны ,Польшчы і Заходняй Беларусі з адозвай, у якой, між іншым, піша:

— Таварышы!

— На Заходняй Украіне з новай сілай разгарэлася нацыянальна-вызваленчая барацьба супроць акупацыі і польскага імпэрыялізму. Гераічныя рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне Заходняй Украіны пасьля крывавай пацыфікацыі, не злажаныя тэрорам і гвалтамі, пэўстаюць зноў да барацьбы за свае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

— Польская буржуазія палепізуе украінскі народ, душыць украінскае школьніцтва і ўкраінскі друк, зьвярыная ненавісьцю зьнішчае і прасьледуе украінскую мову, нішчыць украінскія таварыствы і каапэратывы, кідае ў турмы тысячы рэвалюцыйных рабочых, сялян, інтэлігенцыі і школьнай моладзі. Польская буржуазія што раз усё больш зьвярынымі мэтадамі тэрору імкнецца затрымаць бесперапынны рэвалюцыйны паток вызваленчага руху, клясавай барацьбы пралетарыяту, барацьбы сялян за зямлю бяз выкупу, барацьбы ўсяго працоўнага народу супроць акупацыі польскага імпэрыялізму. Польскія пасьледавацелі Мураўёва-вешацеля пад ганебнай назвай «пацыфікацыі» робяць крывавую расправу над сотнямі і тысячамі украінскіх сялян, рабочых і студэнтаў і вось сёньня рыхтуюць новы ваенна-паліцэйскі пагром на Заходняй Украіне. Хочуць закаваць народ украінскі ў ланцугі яшчэ больш суровай няволі і зрабіць Заходнюю Украіну крэпасьцю для новага кіеўскага паходу супроць Савецкай Украіны.

— Завыла ўся фашысцкая і сацыял-фашысцкая зграя на вестку аб збройным выступленьні украінскіх рабочых і сялян. Крыві—заклікае буржуазная прэса ўсіх масьцей. Новых карных экспэдыцый,—супроць рабочых і сялян. Да гэтага хору шакалаў і сабак буржуазіі далучаюць свой голас яе агенты з абозу контр-рэвалюцыйнай украінскай буржуазіі, агенты, якія прадаюць інтарэсы мільённых мас украінскага народу польскаму імпэрыялізму. Ужо шляць распараджэньні—фашысцкі ўрад Пілсудскага, паны ваяводы і старасты; ужо палдэйска-гайсковыя банды, шпікі і фашысцкія стральцы пачалі сваю фашысцкую работу.

Адозва заклікае працоўных Заходняй Украіны, Польшчы і Заходняй Беларусі да супольнай барацьбы з фашысцкім тэрорам.

— У сваёй справядлівай барацьбе украінскія працоўныя масы павінны знайсьці поўнае падтрыманьне з боку рэвалюцыйнага пралетарыяту і сялянства ўсёй Польшчы. Барацьба за вызваленьне Зах. Украіны і Зах. Беларусі—гэта адначасова барацьба за вызваленьне польскіх працоўных мас. Магутныя забастоўкі рэвалюцыйнага пралетарыяту Варшавы, Дамброўскага вугольнага раёну, гераічная барацьба беспрацоўных па ўсёй краіне дадалі сілы вядучаму барацьбу народу Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Працоўныя масы Польшчы, каб сарваць кайданы эксплёатацыі і ўціску паўнымі дапамагчы змагаючымся працоўным масам прагнаць імпэрыялістычных акупантаў і дабіцца поўнага самавызначэньня прыгнечаных народаў аж да аддзяленьня ад Польскай дзяржавы.

— Зьнішчыць аснову польскага імпэрыялізму на акупаваных землях ,гэта азначае зьнішчыць аснову капіталу ў цэлай Польшчы.

Рабочыя і сяляне Польшчы! Не дамо польскім апрычнікам задушыць гэроічную вызваленчую барацьбу на Заходняй Украіне. Нацыянальна-вызваленчая барацьба працоўных мас Зах. Украіны зьяўляецца нашай барацьбой. Зьнішчым крывавыя пляны фашысцкіх катаў. У водгук рэвалюцыйчай барацьбы рабочых і сялян Заходняй Украіны нехай адазвецца рабочая ву ліца Варшавы, Лодзі, Заглямбя і Сьлёнску і рэвалюцыйная Заходняя Беларусь.

На вулічныя дэманстрацыі, да масавых палітычных забастовак супроць гвалтаў фашысцкіх акупантаў, супроць новага выкананьня крывавай пацыфікацыі гераічнай Зах. Украіны. Да масавай самаабароны супроць фашысцкага тэрору.

— Наперад да барацьбы супроць карных экспэдыцый і фашысцкага тэрору!».

Англія пад ударамі фінансавай катастрофы

ЛЁНДАН, 27-IX. Пастанова біржавога камітэту аб забароне ўтвараць зьдзелкі за наяўны разьлік паставіла біржавых дзельцоў у надзвычайна цяжкае становішча.

Учора амаль ніякіх зьдзелак на біржы не ўтваралася. Пастанова камітэту, зьнішчыць магчымасьць спэкуляцыі фактычна прыпыніла ўсе гандлёвыя біржавыя апэрацыі працякаўшыя на працягу мінулага тыдню ў крайняй напружанай ненармальнай абстаноўцы.

Буйныя фірмы гандлюючыя каленіяльнымі таварамі, ссудавыя і страхавыя кампаніі, а таксама маклеры аказваюць мацнейшы націск на біржавы камітэт, патрабуючы адмены забароны.

ЛЁНДАН, 27-IX. Заўтра адбудзецца паседжаньне габінэту, на якім будзе прынята канчатковае рашэньне аб тэрміне роспуску парляманту і назначэньні новых выбараў.

ЛЁНДАН, 27-IX. У Сіці цыркулююць чуткі аб новых спробах устанаўленьня фінансавага супрацоўніцтва Амэрыкі, Францыі і Англіі, так як валютныя патрасеньні Англіі пачынаюць люта біць таксама па фінансавых посьпехах Злучаных Штатаў і Францыі.

„За альбо супроць сыстэмы голаду,—за альбо супроць сыстэмы капіталу"

ГАМБУРГ, 24-IX. У Гамбурзе пачалася шырокая прадвыбарчая кампанія. Кожны дом, кожная вуліца, кожны куток стаяць пад знакам клясавай барацьбы.

Гэта барацьба ня толькі за мандат у Гамбурскі парлямант, а барацьба за ці супроць сыстэмы голаду, за ці супроць сыстэмы капіталу.

У прадвыбарчай барацьбе ўдзельнічаюць галоўным чынам 3 партыі: камуністы, сацыял-дэмакраты і нацыянал-сацыялісты. Камуністы абвясьцілі сацпаборніцтва на лепшае ўпрыгожаньне вуліцы на лепшыя бальшавіцкія лёзунгі. Цэлыя вуліцы, цэлыя групы дамоў завешаны чырвонымі сьцягамі, рэвалюцыйнымі лёзунгамі, плякатамі і г. д. Сярод сьмелых камуністычных лёзунгаў заклікаючых ісьці на шляху бальшавізму, на шляху Савецкага саюзу і люта змагацца з капіталізмам, стыдліва красуюцца лёзунгі, вярней бездапаможныя крыкі сацыял-фашыстаў: «дапамажэце нам—мы вам дапаможам» і г. д.

Учора ўвечары пралетарыят Гамбургу дэманстраваў па закліку камуністычнай партыі сваю гатоўнасьць да барацьбы, сваю згуртаванасьць, сваю сувязь з кампартыяй. Больш 30 тысяч чалавек разгарнулі свае баявыя сьцягі, сьмела сьпяваючы забароненыя песьні па дарозе да буйнейшай залі Гамбургу на мітынг, дзе выступілі таварышы Тэльман і Гейнц Нэйман. Вялікая заля і нават іншыя суседнія памяшканьні, у якіх былі арганізаваны паралельныя сходы, не маглі ўмясьціць 30 тыс. рабочых, прышоўшых паслухаць сваіх правадыроў. Некалькі тысяч рабочых прастаялі некалькі гадзін на вуліцы, слухаючы прамовы па рупару.

Тав. Тэльман у сваёй прамове азначыў, што, ня гледзячы на тэрор супроць рабочай клясы, камуністычная партыя Нямеччыны дабілася вялізарных посьпехаў, у той час як партыі абанкроціўшагася капіталізму пражываюць свой закат. Толькі за апошнія месяцы 10 тыс. сацыял-дэмакратычных рабочых перайшлі ў кампартыю.

— «Маюцца толькі два шляхі,—заявіў тав. Тэльман,—шлях саюзу сацыял-дэмакратыі з буржуазіяй, гэта ёсьць палітыка «меншага зла». Шлях, які вядзе да фашызму і другі шлях, шлях кампартыі, шлях, які паказвае Савецкі саюз.

У Юнгаўскай Нумеччыне прыдзе час, калі кампартыя выканае сваю місію, калі яна ажыцьцёвіць рэвалюцыйную праграму пралетарыяту. Толькі сацыялізм зьяўляецца выхадам з жабрацтва і голаду. Гэта бліскуча паказвае прыклад Савецкага Саюзу. Толькі тады, калі камуністы возьмуць уладу спыніцца жабрацтва пралетарыяту, сялянства і сярэдніх пластоў насельніцтва. Толькі тады ажыве Гамбурская гавань, якая сёньня ўяўляе сабой могілкі. Беспрацоўныя атрымаюць хлеб і работу.

Але гэтага мы даможамся ня путчамі. Мы гэтага даб'емся адзіным фронтам сацыял-дэмакратычных рабочых, беспрацоўных і камуністаў, жалезным клясавым фронтам працоўных.

Мы змагаемся не за мандаты ў парлямант, мы змагаемся за ажыцьцяўленьне нашай рэвалюцыйнай праграмы самадапамогі, супроць пастаўляючых яе праграме «самадапамогі буржуазіі».

Пагэтаму мы заклікаем працоўных узмацняць чырвоныя батальёны, бо свабода пралетарыяту і ўлада рабочай клясы ня падаюць з неба, а завяёўваюцца рашучасьцю і гераізмам. Прыдзе час, калі прапоўныя Нямеччыны па руску загавораць з сваім клясавым ворагам, па руску будуць змагацца і па руску зажывуць.

9.'00 рабочых Данбасу

Плян па вярбоўцы шахцёраў выкананы на 100,7 проц.

Будаўнікоў завербавана толькі 51 проц. пляну. Неадкладна пераключыцца на вярбоўку будаўнікоў

9 тыс. чалавек і ніводным менш!

Змыць ганебную пляму адставаньня

Паводле вестак упаўнаважаных аб'яднаньня «Вугаль» (на 29-IX) і трэстаў Данбасжылбуд і Укржылбуд (на 27-IX) з БССР на Данбас накіравана, па ўсіх гэтых арганізацыях, 7,077 чал. што складае да кантрольнага заданьня (9.000 чал.)—78,61 проц.

Па аб'яднаньні «Вугаль» кантрольная лічба перавыкавана. На 29-IX з БССР у капальні Данбасу замест 5.000 чал. накіравана—5.039, што складае 100,7 проц. заданьня.

Па трэстах Данбасжылбуд і Укржылбуд заданьне яшчэ далёка невыканана.

Паводле вестак на 27-IX па трэсту Данбасжылбуд з БССР накіравана 1.088 чал., або 72,5 проц. заданьня (ня лічачы сустрэчнага пляну), а па Укржылбуду—950 чал., ці 38 проц. пляну.

Такім чынам, мы зараз маем відавочны прарыў у вярбоўцы будаўнікоў, якіх па абодвух трэстах накірава на 2.038 чал. замест 4.000, што складае 51 проц. (бяз сустрэчнага пляну).

Вось тыя раёны, якія ўвесь час ганебна правальваюць вярбоўку будаўнікоў:

Койданаўскі	замест	150	чал. даў	0
Старобінскі	„	250	„ „	0
Чырвонаслаб дзкі	„	150	„ „	0
Быхаўскі	„	250	„ „	0
Старадарожскі	„	220	„ „	29
Пр пойскі	„	250	„ „	67
Брагінскі	„	200	„ „	55
Цер хаўскі	„	240	„ „	39
Веткаўскі	„	220	„ „	99
Будакашалеўскі		240	„ „	70

Большасьць гэтых раёнаў знаходзіцца на чорнай дошцы і нічога ня робіць, каб змыць ганебную пляму. Толькі Глускі раён, які быў занесен на чорную дошку, у апошнія дні пад цягваецца.

Зараз Глускі раён даў ужо 176 чалавек пры заданьні ў 320. Пры належнай рабоце ён можа да 1-га кастрычніка выканаць сваё заданьне.

Што-ж трэба зрабіць, каб ліквідаваць маючыяся прарыў?

Раней за ўсё трэба неадкладна перакінуцца з вярбоўкі шахцёраў на вярбоўку будаўнікоў. Зусім правільна зрабілі аб'яднаньне «Вугаль» і Наркам працы БССР калі яны далі сваім раённым упаўнаважаным і райінспэктарам працы дырэктыву і дадатковыя нарады на максымальнае разгортваньне вярбоўкі будаўнікоў. Але ў некаторых вярбоўшчыкаў аб'яднаньня «Вугаль» і раённых арганізацый тых раёнаў, якія ўжо выканалі свае папярэднія заданьні, маюцца зусім недапушчальныя настроі — «жаданьне займацца вярбоўкай будаўнікоў для «чужых» арганізацый. Гэтыя настроі павінны атрымаць належны адпор. Ні ў якім выпадку нельга пакладаць рукі і суп

Да справаздачнай кампаніі саветаў

САВЕТЫ БССР ПАВІННЫ УКЛЮЧЫЦЦА У МАСАВЫ АГЛЯД

Сёньня ў масавым аглядзе саветаў удзельнічаюць Магілеўскі раён і Каменскі с-савет

„Справаздачная кампанія не павінна паслабляць, а наадварот, павінна значна ўзмоцніць вырашэньне ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній, якія зараз праводзяцца саветамі" (З пост. ЦВК БССР)

Неадкладна ўзмоцніць масавую работу сельсаветаў Магілеўшчыны

Кампанія хлебазагатовак, выкананьня фінансавых плянаў яшчэ ня стала адной з галоўных задач у рабоце значнай часткі сельсаветаў Магілеўшчыны. Асабліва адстаюць наступныя сельсаветы, як я выканалі пляны па хлебазагатоўках з наступнымі паказьнікамі: **Дасовіцкі** — 0,3 проц., **Слабодзкі**—0,7 проц., **Княжыцкі**—1,8 проц., **Новасельскі**—2,7 проц., **Шчэжарскі** — 2,7 проц., Гэтае ганебнае адставаньне тлумачыцца слаба разгорнутай масавай работай сельсаветаў. Гэтыя сельсаветы ня здолелі мабілізаваць масы на выкананьне гаспадарча - палітычных задач—дрэн на працуюць сэкцыі саветаў. **Бракаўскі** сельскі савет зусім аказаўся ў глыбокім тыле. Гэты сельсавет выканаў загатоўкі: хлеба — 0,6 проц., бульбы —0 проц.

Кулацка-заможныя гаспадаркі па гэтым сельсавеце выканалі 0,7 проц. заданьня.

Сам старшыня Бракаўскага сельсавету **Ліхачоў** апынуўся ў ролі падпявалы кулакоў. Ён бачыце выказвае думку «заданьне кулаку хоць мы і дамо, але яно нерэальнае». Замест жорсткай барацьбы з кулаком, ён гэтым разважаньнем расхалоджвае масу, спадзяецца мабыць на «мірнае ўрастаньне кулака ў сацыялізм».

Сялецкі сельсавет таксама не разгарнуў масавай работы. Ён зусім упусьціў работу з аднаасобным сэктарам. Калі калгасы выканалі 65,3 проц. загатовак, дык аднаасобны сэктар выканаў усяго толькі 5,9 проц. Яшчэ горш, што гэты сельсавет таксама патурае кулаку—процант выкананьня цьвёрдых заданьняў складае толькі 4,9 проц.

Гэты сельсавет зусім адстае па мабілізацыі сродкаў.

Па выкананьні пляну сяўбы Цішоўскі сельсавет на 22-IX мае 18 проц., а па аднаасобным—10 проц.

Нажаль мясцовая газэта «Камунар Магілеўшчыны», не паказвае, як лепшыя саветы змагаюцца за выкананьне палітычна - гаспадарчых задач. А такія саветы ў Магілеўшчыне ёсьць.

Чарназемаўскі сельсавет уключыўся ў конкурс «хто будзе першым» на лепшае выкананьне. гаспадарча-палітычных кампаній. Ён уцягнуў у гэту справу ўсіх калгаснікаў.

Асеньняя сяўба па **Вендараўскім** сельсавеце праходзіць бальшавіцкімі тэмпамі. Пляны сяўбы да тэрміну ня толькі выкананы, але і перавыкананы. Гэты сельсавет, разгортваючы масавую работу, дабіўся перавыкананьня пляну сяўбы. Таксама па гэтым савеце на 15 верасьня выканана на 56,4 проц. пляну загатовак.

Прыбарскі сельскі савет, Гомельска га гарсавету, бальшавіцкім змаганьнем ва генэральную лінію партыі атрымлівае посьпехі. Так, фінплян гэтым саветам выканан поўнасьцю. Для выкананьня плянаў гэты сельсавет абгаворваў пытаньне на групах беднаты, на пленуме сельсавету, па паасобных вёсках. Кантрольныя лічбы разьмяркоўваліся па паселішчах, па якіх вылучаліся брыгады. Гэтыя брыгады абходам двароў у 7 дзён выканалі заданьне па фінансавым пляне. Прыборскі сельсавет разгарнуў масавую работу і змог дабіцца правільнай расстаноўкі сіл.

Гаворачы аб рабоце сельсаветаў Магілеўшчыны э асаблівай сілаю трэба падкрэсьліць палітычную важнасьць разгортваньня і ўзмацненьня масавай работы саветаў. Праводзячы масавую работу трэба рабіць упор на ліквідацыю абязьлічкі. Кожны член савету павінен быць прымацаваны да пэўнай працы. Кожны сельскі актывіст павінен мець вызначанае канкрэтнае заданьне, якое абгаворваецца на сэкцыях ,вытворчых нарадах. Неабходна шырока разгортваць на справе сацспаборніцтва і ўдарніцтва за выкананьне заданьняў.

Вельмі важным пытаньнем у рабоце сельскіх саветаў зьяўляецца яго работа сярод беднаты і груп беднаты пры сельскіх саветах. Гэта работа павінна зьяўляцца галоўнай у раёне, дзе яшчэ няма суцэльнай калектывізацыі. Группы беднаты па радзе сельсаветаў БССР праводзяць вялікую работу па рэалізацыі кантрольных заданьняў, праводзячы цьвёрдую клясавую лінію.

Акрамя. **Прыбарскага** сельсавету новыя формы работы можна знайсьці ў іншых саветах БССР. Адна з такіх новых форм заключаецца ў тым, што ўсе гаспадарча - палітычныя кампаніі праходзяць праз **камісію садзейнічаньня**, якая зьяўляецца апэрацыйным органам (не падмяняючы работу існуючых камісій пры сельсаветах). Такія камісіі пры сельсаветах складаюцца з прадстаўнікоў парткамсамольскіх ячэек, калгасаў і груп беднаты ў ліку 5—7 асоб пад кіраўніцтвам прэзыдыуму савету.

Для лепшага абслугоўваньня тэрыторыя савету разьбіваецца на вучасткі, на якіх працуюць прымацаваныя брыгады. У вёсках і калгасах вылучаюцца сацвыканаўцы. Брыгады праз гэтых сацвыканаўцаў праводзяць работу, атрымліваючы заданьні па зьлётах і на гэтых зьлётах правяраюць выкананьне. Між зьлётамі сацвыканаўца інфармуе кожныя 5 дзён брыгадзіра, які ў сваю чаргу інфармуе камісію садзейнічаньня аб выкананьні работы. Прак тыкуецца ў гэтай рабоце шырока сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Лепшыя работнікі, даўшыя добрыя паказьнікі сацыялістычнага заказу, прэміююцца Адным з такіх прыкладных сельсаветаў зьяўляецца **Станькаўскі** савет, **Кой данаўскага** раёну, прэм'яваны за сваю работу. Таксама прэм'яваны РВК, які ўпарта дабіваецца перабудовы работы сельсаветаў.

Гэтыя формы работы патрэбна перанесьці на саветы Магілеўшчыны. Вы ключную ролю тут адыгрывае РВК, які павінен карэнным чынам перабудаваць кіраўніцтва работай сельсаветаў, яшчэ больш узмацняючы іх як органы пралетарскай дыктатуры.

Да надыходзячай справаздачнай кампаніі павінен быць шырока праведзены агляд работы, узмацненьне асобных вучасткаў, замацаваньне дасягнутых посьпехаў і яшчэ большае ўцягненьне мас у работу саветаў. Разам з гэтым саветы павінны быць ачышчаны ад элемэнтаў, ня здольных змагацца за бальшавіцкія тэмпы.

П-н.

Узоры прыкладнай работы

(Каменскі сельсавет, Лепельскага раёну)

Калектывізацыя па Каменскім сельсавеце адбываецца наступным парадкам. На 1-га кастрычніка 1930 г. 44 проц., на 1-га студзеня 1931 г.—67 проц. і на 10 верасьня бягучага году 99,5 проц.

Такім чынам Каменскі сельсавет ужо завяршыў суцэльную калектывізацыю. Магутнасьць калгасаў характарызуецца наступнымі лічбамі: у ср рэднім на кожны калгас прыходзіцца 993 га зямлі 103 рабочыя коні, 100 галоў буйнай рагатай жывёлы і 36 сьвіней. Калгасы ў асноўным маюць лёнаводны напрамак.

Усе гаспадарча-палітычныя кампаніі выконваюцца з посьпехам. **Плян асеньняй сяўбы выканан на 109 проц.** Уборачнай таксама. Выкананьне фінпляну за першы квартал дасягнула 100 процантаў, у другім — 97 проц. Выкананьне трэцяга падыходзіць да канца. Хлебазагатоўкі за мінулы год выкананы сельсаветам на 103 проц. Зда вальняюча выканаў сельсавет і ўсе іншыя віды загатовак.

Асеньняя сяўба і зяблева закончаны Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы таму, што сельсавет па сапраўднаму павярнуўся тварам да калгасаў.

Сельсавет у кожным калгасе арганізаваў **сыгнальныя пасты**, якія аб усіх недахопах, або асобных непажаданых зьявішчах у калгасах заразжа даводзяць да ведама сельсавету.

Каменскі сельсавет вядзе сыстэматычна-плянавую работу па гаспадарчым замацаваньні калгасаў. Усе вытворчыя пляны калгасаў абгавораны і зацьверджаны на пашыраных пленумах сельсавету з удзелам усіх калгаснікаў. Для практычнай дапамогі калгасам у пераходзе на зьдзельшчыну сельсавет пасылаў спэцыяльныя брыгады, дзякуючы чаму зьдзельшчына поўнасьцю ўведзена ва ўсіх калгасах.

Сельсавет увёў за правіла ня менш 2 разоў у месяц заслухоўваць даклады калгасаў па паасобных галінах, з папярэднім абсьледваньнем іх брыгадамі калгаснікаў.

Адным з галоўных недахопаў у працы гэтага сельсавету зьяўляецца тое, што ён не арганізаваў праверкі выкнаў ўвядзеньня ў калгасах і сельсавце сацыялістычных форм работы сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Усе брыгады па масавым аглядзе працы саветаў павінны мэтады работы Каменскага сельсавету распаўсюдзіць па ўсіх сельсаветах.

Байкаш.

Асеньняя сяўба і зяб

ДАЦЬ КОЖНАМУ саўгасу, калгасу, МТС і брыгадзе

апэрацыйны сутачны плян па ліквідацыі адставаньня ў сяўбе і зяблевым ворыве. Прывесьці ў рух усе сродкі і сілы на поўнае выкананьне пляну

За сутачны апэрацыйны плян

Асеньняя сяўба па цэлым радзе раёнаў Беларусі недапушчальна зацягваецца.

Плян засеву азімых па калгасах і аднаасобным сэктарам на 25 верасьня выканан толькі на 77,9 проц.

Шмат калгасаў не зразумелі таго, што далейшая зацяжка ў сяўбе—удар па ўраджайнасьці азімых.

Асноўнай перашкодай у заканчэньні сяўбы зьяўляецца слабая арганізацыя працы па калгасах.

На радзе калгасаў зьдзельшчына ў асноўных галінах працы па сяўбе не ўведзена .Да асобных брыгад не даведзены нормы выпрацоўкі. Улік працы яшчэ недастаткова наладжан па калгасах і брыгадах.

Зяблевае ворыва па калгасах і аднаасобным сэктары пад пагрозай зрыву. На 25 верасьня плян выканан толькі на 9,7 проц.

Зьмешчаны сёньня матарыял аб ходзе сяўбы і зяблевага ворыва гаворыць аб буйнейшых прарывах у паасобных раёнах і калгасах на гэтым адказным вучастку працы.

Вушацкі раён яшчэ да апошняга часу ганебна цягнецца ў хвасьце па зяблевым ворыве і сяўбе.

Калгас «Чырвоны Прымежнік» плян сяўбы выканаў толькі на 6,8 проц. Гэта здарылася па той прычыне, што «Чырвоны Прымежнік» ня здолеў арганізаваць працу ня змог увесьці штодзённага ўліку зробленай працы кожнай брыгадай.

Раёны і калгасы павінны ў бліжэйшыя дні рапартаваць аб поўным сканчэньні асеньняй сяўбы і выкананьні плянаў па зябу.

Для хутчэйшага заканчэньня сяўбы неабходна кожнай брыгадзе даць сутачныя нормы працы. Кожнаму саўгасу, МТС калгасу і брыгадзе трэба завесьці сутачныя пляны па зяблевым ворыве і сяўбе.

Пяцідзённік штурму даў рашучы пералом

18 калгасаў цалкам скончылі сяўбу

Бабруйск (Белта). Абвешчаная ЦК КП(б)Б ударная пяцідзённка сканчэньня асеньняй сяўбы дала належны зрух.

Сяўба па раёне праходзіць пад знакам 100 проц. выкананьня і перавыкананьня пляну азіміны. На штурм сканчэньня азімай сяўбы Райком КП(б)Б мабілізаваў 30 чалавек. На гэты адказны вучастак працы мабілізаваны ўсе шэфскія і прафсаюзныя арганізацыі і ўсе калгасна-бядняцка-серадняцкія масы.

Райкалгассаюз па сваёй лініі мабілізаваў 30 чалавек. На гэты адказны вучастак працы мабілізаваны ўсе шэфскія і прафсаюзныя арганізацыі і ўсе калгасна-бядняцка-серадняцкія масы.

Райкалгассаюз па сваёй лініі мабілізаваў усіх адказных працаўнікоў, агранамаў і інструктароў на завяршэньне асеньняй сяўбы.

На 22 верасьня скончылі сяўбу 18 калгасаў. Плян сяўбы на раёне выкананна 97,1 проц.

Але зяблевае ворыва па раёне яшчэ і да апошняга часу праходзіць зусім нездавальняюча. Пад зяб ўзьнята толькі 18,7 проц.

Гэты вучастак працы павінен быць падцягнут.

Уперадзе ішлі лепшыя ударнікі

Чавусы. Калгас «Новае Жыцьцё» першым ў раёне скончыў асеньнюю сяўбу. Паводле пляну патрэбна было засеяць 78 га, засеяна—80. Жыта ўсё цалкам было ачышчана і пасеяна радковым сеўнікам. Праца праходзіла па ўдарнаму, калгаснікі адмовіліся ад выходных дзён.

Наперадзе ішлі брыгады лепшых ударнікаў на чале з Раманоўскім Карнеем, 60 гадовым старыком.

Ударная сяўба агітуе за прыклад

Дуброўна. (Белта). У вёсцы Рыбалтове. Парыцкага с.-с., за час асеньняй сяўбы арганізаваны калгас з 18 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак імя райгазэты «За сацыялістычнае будаўніцтва». Калгаснікі дружна ўзяліся за работу па абагульненьні маемасьці і ўраджаю. 13-га верасьня новыя калгаснікі арганізавалі чырвоны абоз па здачы збожжа дзяржаве.

Да тэрміну скончылі сяўбу

Дзякуючы ўвядзеньню зьдзельшчыны, правільнай расстаноўкі сіл, калгас «Новыя Русакі», Гарадзішчанскага сельсавету, Шклоўскага раёну, датэрмінова скончыў асеньнюю сяўбу.

Плян азімых перавыкананы.

Троська.

Ударна скончыў сяўбу

калгас „Чырвоны Партызан"

Калгас «Чырвоны Партызан» Дукорскага сельсавету, Пухавіцкага раёну па ўдарнаму скончыў сяўбу. Паводле пляну было намечана засеяць азіміны 20 га, а калгас пашырыў плошчу да 30 га. Увесь азімы клін быў засеян у асноўным да 15-га верасьня.

Усім калгасам Дукорскага сельсавету трэба скарыстаць прыклад калгасу «Чырвоны Партызан».

Брыгада «Сав. Бел.: Ц. Лявіцкі, В. Страх, Ц. Шіпак, М. Слуцкі, А. Кунько, Пісарчык Т., М. Строх.

Вушаччына не пачула сыгналаў друку

Плян па ўздыму зябу выкананна толькі на 4 проц.

Зяблевае ворыва па Вушацкім раёне праходзіць ганебна марудным тэмпамі. Ня гледзячы на цэлы рад трывожных сыгналаў раённага і цэнтральнага друку, сельсаветы, сельпартыкомы, партыйныя і камсамольскія ячэйкі яшчэ і да сучаснага моманту на гэты вучастак работы ўвагі абсалютна ніякай не зьвяртаюць.

Рашэньні партыі і ўраду аб тым, каб на зяблевае ворыва было перакінута 30 проц. конскай цягавай сілы, ніводзін сельсавет і калгас ня выконвае. Згодна зьвестак МТС, у калгасах, якія яна абслугоўвае, толькі 23 проц. конскай цягавай сілы перакінута на зяблевае ворыва. Гэты факт сьведчыць аб яўным ігнараваньні пастаноў партыі і ўраду.

Яшчэ ў горшым становішчы справа з зяблевым ворывам па аднаасобным сэктары. Аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы: калі па калгасным сэктары на 20 верасьня ўзьнята зябу 837 замест 6.878 га, дык па аднаасобным сэктару замест 1.772 га зазяблена толькі 46 га, што складае 2,8 проц. выкананьня пляну зяблевага ворыва.

Асноўная віна ў тым, што на мясцох па сельсаветах для правядзеньня гэтай работы аднесьліся па апартуністычнаму. У многіх калгасах і сельсаветах гаварылі аб тым, «што зяблевым ворывам няма часу займацца, зіма далёка». У многіх мясцох правядзеньне ўсіх гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў раскладалі па «полачках». Вось галоўнейшыя прычыны, якія прывялі зяблевае ворыва да патражаючага становішча.

На фронце зяблевага ворыва патрэбна зрабіць рашаючы пералом.

Брыгада «Сав. Б.» К. Кароль, І. Карцель,

Манэўры РСЧА

Скарыстоўваючы вопыт манэўраў,

ліквідуючы недахопы, пашыраючы вайсковыя веды—

УЗМАЦНЯЦЬ АБАРОНУ КРАІНЫ

„Камунар"—узорны

Барацьбіты за сацыялізм, за абарону сацыялістычнай краіны

10 гадз. 45 хвіл. Сыгнал паветранай трывогі.

10 гадз. 50 хвілін. Начальнікі цэхаў дакладваюць аб тым, што команда ў зборы, людзі на мясцох, пасты расстаўлены.

10 гадз. 53 хвіліны. Начальнікі цэхоў рапартуюць: работа ідзе нармальна, ля дзьвярэй выстаўлены пасты, забяспечана дэгазацыя паўфабрыкатаў, якія паступаюць у цэхі, рабочыя, якія ўваходзяць у склад каманд, заменены людзьмі з рэзэрву.

11 гадз. 25 хвілін. Данясеньне паста УНАГ: на Пралетарскай ля сталоўкі скінута бомба.

11 гадз. 28 хвілін. Каманда ўжо прыступіла да дэгазацыі «атручанага вучастку».

11 гадз. 50 хвілін. Загад штабу СПА выслаць пажарную каманду да Дому Культуры.

11 гадз. 53 хвіліны. Каманда выехала на месца назначэньня.

11 гадз. 57 хвілін. Загад штабу СПА: пунктавой камандзе выехаць на Эльвод для дэгазацыі.

12 гадз. 10 хвілін. Каманда ўжо на Эльводзе, прыступіла да работы, дэгазавала 900 кв. мтр., пераехала да дому СНК, дэгазавала тут 1.200 мтр.

13 гадз. 25 хвілін. Каманда зьвярнулася на завод.

Зусім маленькія лічбы кароткіх тэрмінаў, якія гавораць аб вялізарнейшай справе—справе абароны краіны.

Усё гэта было заўчора, 27 верасьня.

Яшчэ раней, 25 верасьня, сірэны засьпявалі ўвечары каля 9 гадзін: «працаўнік» ляцеў на горад.

Рабочыя—байцы каманд СПА ў той час слухалі канцэрт у клюбе заводу.

— Каманда, па мясцох!

І менш як за 10 хвілін байцы занялі свае пасты. Завод быў гатоў сустрэць «ворага».

За гэты-ж тэрмін прыбыў і рэзэрв—рабочыя, якія былі па кватэрах.

На 15 хвілін спазьніліся інваліды—старыя рабочыя т. т. **Байдак і А. Левін.** Яны «спазьніліся»: яны былі дома, г. зн. яны за 25 хвілін прабеглі 6 кілёмэтраў. Гэта—інваліды, старыя рабочыя.

У часе трывогі, 24-га верасьня, калі ўдзень наляцелі сталёвыя птушкі «працаўніка», каманды заводу «Камунар» былі сваячасова на мясцох. Ужо тады была адзначана высокая дысцыпліна, вялікі ўздым байцоў—рабочых. Але тады таксама былі адзначаны некаторыя недахопы.

25-га ўначы гэтыя недахопы ўжо не наглядаліся: **камунараўцы** ўсе іх выправілі.

Працоўныя Менску памятаюць гэты вечар і ноч 25 верасьня. Трывога адбылася каля 9 гадзін. Праз хуткі час быў даны адбой трывогі. Пасьля зноў—трывога, рокат матораў, выбухі бомб...

Толькі позна ўначы—адбой.

Пасьля адбою байцы-камураўцы правялі сход—разбор дзеяньняў у часе «нападу».

Пасьля канцэрт працягваўся.

Каля 5 гадзіны раніцы палеглі спаць байцы, але а 7 гадзіне яны былі ўжо ля варштатаў.

2 гадзіны адпачынку пасьля работы на баявых пастох пад дажджом на халодным ветры, пасьля нэрвовага і фізычнага напружаньня.

І ўсё-ж не здалі тэмпаў у гэты дзень камунараўцы на вытворчасьці. Як раней рухаліся варштаты, як і раней працавалі рабочыя, ня дрыжэлі іх рукі.

Штаб аб'екту заводу «Камунар» (былы габінэт дырэктара).

Начальнік аб'екту тав. Эрнгрос, ваенком, дзяжурны ля тэлефону, сувязныя—пасыльныя...

Чотка дае загады тав. Эрнгрос.

Чотка загады выконваюцца.

— Алё. Ля тэлефону начальнік аб'екту...

— ...

— Ёсьць, тав. начальнік, выслаць пажарную да дому культуры.

Праз 3 хвіліны пажарная каманда ўжо выехала.

Пунктавая каманда «Камунара» ў гэты дзень упяршыню матарызавана: дана 4 аўтамашыны.

— Каманда! На машынах.

Пагружаны барабаны, скрыні, уся маемасьць, пагрузіліся людзі.

Над заводам—самалёты «працаўніка»: каманда выгружаецца, выгружаюць маемасьць, хаваюцца ў памяшканьні. Самалёты аддаляюцца—праз 2 хвіліны каманда, маемасьць зноў на машынах.

Ніякай мятусьні. Кожны ведае сваё месца.

Загад—і зараз чоткае яго выкананьне.

Начальнік аб'екту:

— Таварыш сувязны.

— Ёсьць, таварыш начальнік.

— Пойдзеце ў сталоўку, скажэце: бомба ўзарвалася на Пралетарскай вуліцы. Вецер мае напрамак на сталоўку. Прыняць належныя захады.

— Ёсьць, таварыш начальнік.

Паварот кругом, сувязны — маладая дзяўчына ідзе ў сталоўку, на—хаду рыхтуючы процігаз.

Чоткасьць, дысцыпліна, бадзёры выгляд, бадзёры настрой...

Прыходзіць загадчык аднаго цэху:

— Таварыш начальнік, абед загадаеце адкласьці?

— Навошта? У сучасны момант над заводам самалётаў няма. Агульнага гудка ня трэба.. Дайце сірэны ў цэху, выпускайце рабочых па-аднаму—бегам,, ланчужком да сталоўкі. Ніякай перашкоды ў рабоце цэху.

— Ёсьць.

Ніякай перашкоды, ніякай затрымкі ў рабоце цэхоў.

Гераічна змагаецца ўзорны «Камунар» за генэральную лінію партыі, за прамфінплян, за абарону сваёй сацыялістычнай краіны...

Заўсёды наперадзе партыйцы і камсамольцы.

Шырока разгорнута масавая работа.

Толькі ў часе «нападу»—выпушчана 7 насьценгазэт. Растуць рады КП(б)Б, 29 лепшых ударнікаў—у партыю, 80 рабочых падпісалася дадаткова на пазыку, 4 брыгады перайшлі на гаспадарчы разьлік, у разборы дзеяньняў у часе «нападу» актыўна ўдзельнічаюць шырокія масы байцоў, ёсьць вынаходніцтвы па СПА...

М. Хаванскі.

Узорныя вынікі вялікай справы

Раён манэўраў 27-IX. Сёньня адбыўся разбор манэўраў БВА.

Першым выступіў член Рэўваенсавету БВА—галоўны палітыкіраўнік манэўраў тав. **Аранштам.**

Манэўры праходзілі на фоне буйнейшых палітычных падзей за мяжой (мятэж у ангельскім флоце, далейшае паглыбленьне крызісу), на фоне пасьпяховай барацьбы СССР за завяршэньне праграмы 3 рашаючага году.

Гэтыя абставіны выклікалі вялізарны ўздым актыўнасьці байцоў, і шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У выніку манэўраў вырасьлі партыйна-камсамольскія арганізацыі часьцей (было пададзена заяў у партыю 1502, у камсамол 549).

Ня гледзячы на складанасьць задач і на надзвычайна цяжкія мэтэаралёгічныя ўмовы, агульнае палітычна-маральнае становішча манэўруючых часьцей было на належнай вышыні. Наглядалася ўзорная дысцыпліна-ванасьць, каштоўная ініцыятыва і шматлікія факты гераізму ў выкананьні баявых загадаў.

У заключэньні тав. Аранштам падкрэсьліў—што зараз, з уходам на зімовыя кватэры, неабходна усебакова глыбока прапрацаваць рынкі манэўраў, захаваць і ўсямерна падвышаць узятыя тэмпы баявой падрыхтоўкі.

Пасьля тав. Аранштама з прамовай выступіў камандуючы БВА галоўны кіраўнік манэўраў тав. **Убарэвіч.**

Манэўры—зазначыў тав. **Убарэвіч,**—перш за ўсё паказалі выносьлівасьць, арганізаванасьць і сталую гатоўнасьць войск у выкананьні пастаўленых задач, выявілі ўменьне арганізаваць моцны ўдар.

Дажджы, грязь, начныя маршы не толькі не адбіліся на пасьпяховасьці разгортваньня і правядзеньня манэўраў, а наадварот, склаўшы ўмовы блізкія да сапраўднай ваеннай абстаноўкі, садзейнічалі ўзмацненьню баявой вывучкі манэўраваўшых частак. Бліскуча працавала авіяцыя. Добрыя вынікі дала №-ская пяхотная і №-ская кавалерыйская дывізіі.

Кіраўніцтва, войскам з боку камандаваньня, работа палітапаратаў на манэўрах была спакойная, упэўненая і цьвёрдая. Загады Рэўваенсавету і патрабаваньні Наркамваенмора тав. **Варашылава,** часьці нашае акругі выканалі.

У заключэньні тав. **Убарэвіч** ад імя Рэўваенсавету акругі падзякаваў начальніцкі і чырвонаармейскі склад часьцей за пасьпяховае правядзеньне баявой вучобы. **(Белта).**

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Пра забясьпечаньне гор. Менску дровамі

Адзначаючы, што дырэктыва аб завозе ў гор. Менск у пэрыяд з мая да кастрычніка 1931 г. 10.000 вагонаў дроў Лесбелам ня выканана, што зрывае нармальнае снабжэньне гораду дровамі, і што Менскі Гарадзкі Савет ня змог дабіцца забясьпечаньня выкананьня пляну завозу дроў і выкананьня пляну загатоўкі дроў Менскім леспрамгасам, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Лесбел забясьпечыць завоз у гор. Менск у кастрычніку і лістападзе ня менш як па 100 вагонаў дроў штодзень з тым, каб было забясьпечана нармальнае снабжэньне дровамі ўжо ў кастрычніку і створан двохмесячны запас дроў.

2. З прычыны абсалютна нездавальняючага снабжэньня дровамі гор. Менску і недастатковай колькасьці вагонаў, якія падаюцца пад дровы, абавязаць Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Шляхоў пры СНК БССР тав. Палюдава ўжыць захады для забясьпечаньня завозу ня менш як па 100 вагонаў дроў штодзень як па лініі МББ, так і па лініі Заходніх чыгунак.

3. Для максымальнага скарачэньня стаянкі вагонаў пад пагрузкаю і выгрузкаю, устанавіць што пад пагрузкаю вагоны павінны стаяць ня больш трох гадзін ,а пад выгрузкаю—дзьвёх гадзін.

Абавязаць Лесбел забясьпечыць на мясцох своечасовую дастаўку дроў да чыгункі для пагрузкі, а таксама і рабочаю сілаю пагрузку.

4. Прапанаваць Беларускай Канторы Саюзтрансу на працягу 3-х дзён арганізаваць у гор. Менску рабочую арцель для выгрузкі дроў, якая павінна забясьпечыць такі парадак работы, каб вагоны выгружаліся на працягу дзьвёх гадзін з часу падачы вагону.

5. Абавязаць дырэкцыю Эльвода і Белтофаб'яднаньня неадкладна пачаць вывазку торпу з такім разьлікам, каб на працягу кастрычніка-лістапада забясьпечыць двохмесячным запасам апалу Менскую электрастанцыю.

Абавязаць Лесбел на працягу кастрычніка-лістапада стварыць ня менш месячнага запасу дроў паводле пляну снабжэньня Эльвода .

6. Абавязаць Менскі гарадзкі савет устанавіць такі парадак работы па забясьпечаньні гор. Менску дровамі, які забясьпечыў-бы выкананьне гэтай пастановы.

7. Абавязаць усе прадпрыемствы і ўстановы захоўваць максымальную эканомію апалу.

8. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты ўжыць усе захады да падвозкі дроў да тых пунктаў чыгункі, з якіх дровы вывозяцца ў гор. Менск.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР А. КАЛНІН.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

28 верасьня 1931 г. г. Менск.

БДВТ павінен працаваць бесьперабойна

Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр павінен з 1-га студзеня зрабіцца стацыянарным БДТ-3. Што для гэтага робіцца? Нічога. Кіраўніцтва тэатру нават не паклапацілася скласьці пляны работы.

Больш таго, 15 верасьня тэатр павінен быў выехаць на манэўры. Што ён меў для гэтага? Таксама нічога. П'есы, якія ёсьць у рэпэртуары—не маглі (ды і зараз ня могуць) ісьці,—няма належнай колькасьці актораў, не адрамантаваны дэкарацыі пасьля дарожжа. Нават не змаглі павесьці добрападрыхтаванага канцэрту з-за адсутнасьці памяшканьня для работы.

Тэатр працуе ўжо з 8-га верасьня, а яшчэ невядома—якую п'есу рыхтаваць, з кім будуць працаваць. Уся работа была пушчана па хвалях самацёку.

Аб рацыянальным скарыстаньні працоўнага часу артыстамі дагэтуль ніхто нават і не падумаў. Бывае так: артысты прыходзяць на работу і... сядзяць гадзіну, другую, трэцюю... і пасьля ім абвяшчаюць, што «заняткаў сёньня ня будзе». І ўсё гэта робіцца ў той час, калі тэатр перажывае грашовыя труднасьці.

Калектыў актораў б'е трывогу. Тэатр павінен працаваць бесьперабойна. Савецкая грамадзкасьць павінна аказаць дапамогу тэатру. Вінаватыя ў зрыве дзейнасьці тэатру павінны атрымаць па заслугах.

Артыст.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР

ГУТА—Кобеца

Пачатак а 8 гадз. Білеты ў рабкасе і тэатру.

ДЗЯРЖЦЫРК

АПОШНІЯ ДНІ ПРАЦЫ Зачыненьне 30 верасьня

НОВАЯ БАЯВАЯ ПРАГРАМА

Каса ад 12 гадз. дня. Білеты са скідкай у рабочай касе Пач. а 8 з пал. г

Кіно-тэатр Культура — Новы мастацкі фільм па раману Фадзеева „Разгром". Пач. а 7 гадз. Каса з 5 гадз.

КІНО ІМЯ ВІТЭБСКАГА — Мастацкі фільм Луна зьлева Звыш праграмы кіно-хрон. № 46 Працуе з 12 гадз. дня

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ" — Толькі 3 дні мастацкі фільм Банда бацькі Кныша Зьверх праграмы хрон. саюзкіно № 47

„Чырвоная Зорка" — Гукавы фільм ПУЦЕЎК ЖЫЦЬЦЕ Пачат. а 7 г., 8 45 і 10 г. Каса ад 5 г.

Згодна пастановы Прэзыдыуму ВСНГБ

ПРЫ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР

(Менск, Рэвалюцыйная № 1)

арганізавана бюро па буйных рабочых вынаходзтвах і рацыналізатарскіх прапановах

ДЛЯ ЛІКІ

Адказны кансультант бюро прымае наведвальнікаў кожныя 4, 9, 14, 19, 24, 29 ад 1 да 4 гадз. дню.

З 10 кастрычніка 1931 году, 18 вучастак

—„БЕЛСЕЛЬБУДУ"—

АДЧЫНЯЕ 2-х МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ

па падрыхтоўцы цесьляроў (плотнікаў)

Курсантам выплачваецца па 2 рублі ў дзень за правадзімую работу з забясьпечаньнем кватэраю

На курсы прымаюцца калгаснікі з прадстаўленьнем даведак ад праўленьня калгасу, рабочыя занятыя на работах у саўгасах, аднаасобнікі, батракі і беднякі з сялян.

Заяву падаваць у кантору 18 будвучастку: Бабруйск, рог Лексрта і Урыцкага № 1 і прарабам наступных саўгасаў: Свіслач, Старыя-Дарогі, Харомцы Завалочыцы, Веснава, Несята, Побалава, Забалацьце, Дурынічы, Бацэвічы, Дойнічава, Молатава, Хальч і Эрштэр-Май.

КАНТОРА 18 БУДВУЧАСТКУ „БЕЛСЕЛЬБУДУ"

Для складаньня вытворчага пляну работ на 1932 год ПА БУРАВЫХ, ШАХТНЫХ СТУДНЯХ І ВАДАПРАВОДЗЕ

„БЕЛВОДТРЭСТ" аб'яўляе,

што да 15-Х г. г. прыймае заяўку на гэтую работу ад зацікаўленых арганізацый, пасьля гэтага тэрміну

ЗАЯЎКІ ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.

Вышукальнае будаўніцтва па бурэньні трэст ня прымае

Заяўкі дасылаць па адрасу: Менск, Старажоўская вуліца, д. № 11, „БЕЛВОДТРЭСТУ".

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэктараў —6-15. Выдавецтва—2-44. выпускаючага 12-65 два зв.

падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.